# Новыя сусветныя тэхналогіі і практыкаарыентаванасць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця форуму прыняў удзел **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** Ён нагадаў, што 2024-ы ў Беларусі аб'яўлены Годам якасці. Медыцына не выключэнне.

— Менавіта ад якаснай медыцынскай дапамогі залежыць стан здароўя кожнага чалавека. Мы забяспечваем аказанне неабходнай меддапамогі, пачынаючы ад самай маленькай вёсачкі і да хутара і заканчваючы абласнымі цэнтрамі і сталіцай нашай краіны. Выбудаваная сістэма меддапамогі дае магчымасць аказаць людзям увесь спектр медпаслуг, — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі вельмі вялікая ўвага ўдзяляецца падтрыманню здаровага ладу жыцця.

— Там, дзе патрэбна кваліфікаваная і якасная медыцынская дапамога, мы развіваем гэтыя кампетэнцыі, тэхналогіі. Сёння вы зможаце наглядна пераканацца, як развіваецца сістэма аховы здароўя нашай краіны, як укараняюцца передавыя міжнародныя тэхналогіі і практыкі, неабходныя для аказання якаснай і кваліфікаванай медыцынскай дапамогі.



Пры гэтым падтрыманне здароўя ў многім залежыць ад кожнага чалавека, а медыкі пракансультуюць пацыента, які мае патрэбу ў адпаведнай меддапамозе. Адметна, што ўзровень беларускіх урачоў даўно ацанілі нашы суседзі і грамадзяне з больш далёкіх краін.

— Мы ганарымся тым, што толькі па выніках мінулага года экспарт медыцынскіх паслуг у 140 краін свету склаў больш як 40 мільёнаў. Актыўна працуе наша сістэма адукацыі. Студэнты з больш як 50 краін атрымліваюць якасную медыцынскую адукацыю. Толькі за мінулы год лічба экспарту адукацыйных паслуг склала больш як 30 мільёнаў, — прывёў лічбы Ігар Петрышэнка.



Ён адзначыў, што на выставачнай пляцоўцы прадстаўлены ўсе найлепшыя распрацоўкі РНПЦ, перадавых клінік — увесь спектр, які датычыцца падтрымання здароўя чалавека. У час дзелавой праграмы будуць актыўна абмяркоўвацца і выпрацоўвацца новыя падыходы, новыя методыкі для аказання медыцынскай дапамогі. Сярод іх — укараненне штучнага інтэлекту.

— Аднак, як бы не развівалі штучны інтэлект, перадавыя тэхналогіі, усё залежыць ад кваліфікацыі ўрача і яго ведаў, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Аб новых тэхналогіях, у прыватнасці перспектывах лічбавай трансфармацыі сферы аховы здароўя, гаварыў і **міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ.** Лічбавізацыя дасць магчымасць адысці ад залішняга дакументаабароту, медработнікі змогуць больш аператыўна атрымліваць неабходную інфармацыю аб пацыенце.

— Мы працуем над тым, каб аб'яднаць усе існуючыя распрацоўкі ў адзіную платформу. Гэта павінна адбывацца на працягу 2024—2025 гадоў, — адзначыў міністр.

І ўжо ў пачатку 2025 года аб'яднанне існуючых праграмных рашэнняў дасць свой вынік, а першы этап гэтай работы павінен завяршыцца да канца 2024 года.

Гаворачы аб напаўненні будучай адзінай сістэмы электроннай аховы здароўя, Аляксандр Хаджаеў назваў сэрвісы, якія датычацца электроннага рэцэпта, электроннай аптэкі, электроннага дакументаабароту і інш.

Што датычыцца спецыялізаванай выстаўкі, якая праходзіць у рамках міжнароднага медыцынскага форуму, то яна дэманструе працэс імпартазамяшчэння ў гэтай сферы.

— Усе нашы ноу-хау датычацца ў першую чаргу практыкі кожнага дня. Мяне вельмі ўзрадавала тое, што адбылося імпартазамяшчэнне. Нашы рэанімацыйныя ложкі валодаюць усім функцыяналам, які неабходны для штодзённага маніторынгу і аблягчэння працы, у тым ліку і функцыяй узважвання. Тыя задачы, якія ставяцца нашымі ўрачамі-практыкамі, павінны Міністэрствам аховы здароўя аналізавацца, аб'ядноўвацца і пераўтварацца ў вынік, — адзначыў Аляксандр Хаджаеў.

Ложак з электрапрывадам і функцыяй узважвання, пра які казаў міністр, прадстаўлены на стэндзе дзяржаўнага прадпрыемства «Медтэхнацэнтр», вядучага беларускага вытворцы ў галіне медыцынскага абсталявання і вырабаў медпрызначэння. Выстаўлены тут і іншыя апошнія распрацоўкі прадпрыемства, накіраваныя на паляпшэнне якасці аказання меддапамогі. Гэта каляска-каталка з прыёмный прыладай і эвакуацыйнае крэсла для аўтамабіля хуткай медыцынскай дапамогі; крэсла-скутар для інваліда; сістэма маніторынгу і дыспетчарызацыі медыцынскіх газаў з выкарыстаннем «воблачных» сэрвісаў і магчымасцю інтэграцыі дадатковых функцый маніторынгу (мікраклімат у палатах, месцазнаходжанне пацыента ў структуры лячэбнай установы і інш), якая на базе нейрасеткі ідэнтыфікуе і прагназуе паказчыкі, у некаторых выпадках папярэджваючы наступствы яшчэ да ўзнікнення інцыдэнту.

На калектыўных стэндах холдынга «Белфармпрам» і прадпрыемства «Белмедтэхніка» прадстаўлены айчынныя распрацоўкі экспартаарыентаванай медтэхнікі і лексродкаў. Міністр адзначыў, што распрацоўкі РУП «Медтэхнацэнтр», холдынга «Белфармпрам» аблягчаюць працу медработнікаў і павышаюць якасць аказання медыцынскай дапамогі.

— Наша выстаўка дэманструе тое, што новыя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ва ўсім свеце, ёсць і ў нашай краіне. Адпаведна, якасць медыцынскай дапамогі адпавядае сусветным стандартам, — падкрэсліў Аляксандр Хаджаеў.

Арганізавана на выстаўцы і традыцыйная «Адукацыйная алея» з універсітэтаў медыцынскага профілю Беларусі — спецыяльная пляцоўка для прэзентацыі адукацыйных паслуг і дэманстрацыі інавацыйных распрацовак устаноў адукацыі. А РУП «Белфармацыя» прадставіла дзіцячы адукацыйны праект «Юны фармацэўт» — сімуляцыйную міні-аптэку, створаную для знаёмства дзяцей з прафесіяй фармацэўта.

У выстаўцы бярэць удзел больш за 160 экспанентаў з васьмі краін: Беларусі, Венгрыі, Індыі, Ірана, Кітая, Расіі, Егіпта, Паўднёвай Карэі. Шырокі асартымент вырабаў медыцынскага прызначэння можна ўбачыць на калектыўнай экспазіцыі індыйскіх вытворцаў. Упершыню ў выстаўцы ўдзельнічае кампанія Soficopharm, якая з'яўляецца важным гульцом на фармацэўтычным рынку Егіпта. Акрамя таго, упершыню ў Беларусі свае магчымасці прадставіць Няўрадавы фонд даследаванняў і тэхналогій медыцынскага абсталявання Ірана.

Удзельнікі выстаўкі, прадстаўнікі, дыстрыб'ютары і сэрвісныя арганізацыі падрыхтавалі шырокі спектр прадукцый і паслуг для ўстаноў аховы здароўя і медыцынскіх цэнтраў.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Вялікабрытанія пачне адпраўляць нелегальных мігрантаў у Руанду не раней за ліпень



Першыя рэйсы ў Руанду з нелегальнымі мігрантамі, якія дэпартуюцца з Вялікабрытаніі, адправяцца праз 10-12 тыдняў, не раней за ліпень, заявіў брытанскі прэм'ер-міністр Рышы Сунак. Яго цытуе Guardian. Раней меркавалася, што дэпартацыя нелегалаў у Руанду пачнецца ўжо вясной. У затрымцы прэм'ер-міністр абвінаваціў лейбарыстаў і Палату лордаў, якія чынілі розныя перашкоды на шляху прыняцця неабходнага закона. Тым не менш урад Вялікабрытаніі дабіўся яго зацвярджэння абедзвюма палатамі парламента. Каб набыць сілу закона, біль павінен быць у найбліжэйшыя дні зацверджаны каралём Карлам III. Вывозіць мігрантаў будуць камерцыйнымі чартарнымі рэйсамі, гэта будзе рабіцца рэгулярна. Схему прапанаваў вясной 2022-га тагачасны прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан, каб разбурыць бізнес-мадэль па перавозцы нелегальных мігрантаў у Вялікабрытанію. Тады ж краіны падпісалі пагадненне аб міграцыйным партнёрстве, і Лондан паабяцаў інвеставаць 120 млн фунтаў у развіццё эканомікі Руанды, фінансаваць знаходжанне нелегалаў у гэтай краіне і іх інтэграцыю.

### У ЦАР трохдзённая жалоба па ахвярах караблекрушэння



У Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы (ЦАР) з пачатку тыдня аб'явілі трохдзённую жалобу ў сувязі з гібеллю амаль 60 чалавек пры караблекрушэнні на рацэ Мпока ў сталіцы краіны Бангі. Пра гэта заявіў прэзідэнт ЦАР Фостэн-Арканж Туадэра, паведаміла ТАСС. Судна, на борце якога знаходзіліся 300 пасажыраў, затанула адразу ж пасля выхаду з порта. Паводле інфармацыі СМІ, людзі накіроўваліся ў вёску для ўдзелу ў пахаванні. Сведкі здарэння расказалі, што карабель практычна разламаўся напалову на сярэдзіне ракі. Выратаваць удалося каля 100 чалавек. Урад распарадзіўся стварыць камісію для вызначэння прычын здарэння. Спецыялісты лічаць, што да караблекрушэння прывяло значнае перавышэнне колькасці пасажыраў, якіх судна магло ўзяць на борт для бяспечнага плавання.

### У Чэхію пасля 30-градуснай спякоты прыйшлі рэкордныя для красавіка маразы



Паводле звестак Чэшскага гідраметэаралагічнага ўпраўлення, на паўночным захадзе Чэхіі была зафіксавана тэмпература мінус 11,7 градуса па Цэльсію. Рэкордна нізкая тэмпература паветра была адзначана метэастанцыямі і ў іншых рэгіёнах Чэхіі. У шэрагу населеных пунктаў выпаў снег, таўшчыня покрыва якога дасягае месцамі больш за 30 см. Халоднае надвор'е захоўваецца. Аб гэтым інфармуе чэшскае інфармацыйнае агенцтва ЧТК, перадае ТАСС. Эксперты звяртаюць увагу, што небывалыя красавіцкія маразы могуць нанесці значную шкоду фруктовым дрэвам, вінаграднікам і высаджаным агародніным культурам, што пагражае сёлетняму ўраджаю. Метэаролагі звяртаюць увагу, што маразы змянілі трапічную спякоту, якая стаяла ў Чэхіі яшчэ некалькі дзён таму. Слупок тэрмометра ў краіне падымаўся да адзнакі 31,5 градуса. Такія прыродныя анамаліі звязваюць з працэсам глабальнай змены клімату на планеце.